# ИСТОРИЯ
# HISTORY

УДК 327.2:910.4

**В. А. Астрога**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

## УПЛЫЎ ВЯЛІКІХ ГЕАГРАФІЧНЫХ АДКРЫЦЦЯЎ НА РАЗВІЦЦЁ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ГЕАПАЛІТЫЧНАЙ ДУМКІ

У артыкуле разглядаецца развіццё геапалітычных поглядаў у Еўропе ў перыяд Вялікіх геаграфічных адкрыццяў. Дадзена дэталёвая характарыстыка сутнасці эпохі вялікіх падарожжаў, прааналізаваны і ахарактарызаваны творы найбольш яркіх і вядомых у гэтай галіне еўрапейскіх філосафаў, географаў і гісторыкаў, эканамістаў і юрыстаў: Фернандэс дэ Авьеда, Барталаме дэ Лас Касас, Жан Бадэн, Гуга Гроцый, Уільям Пэн, Ш. Л. Мантэск'ё, А. Ж. Цюрго. Выяўлена сувязь геапалітычных поглядаў і канцэпцый еўрапейскіх мысліцеляў з антычнымі геапалітычнымі тэорыямі. Адзначана нявывучанасць праблемы развіцця еўрапейскай геапалітычнай думкі ў айчыннай гістарыяграфіі. Зроблена выснова, што геапалітычныя погляды мысліцеляў Еўропы сталі ў далейшым падмуркам тэорый класікаў геапалітычнай думкі XIX–XX стагоддзяў і сучаснасці.

**Ключавыя словы:** гісторыя, геаграфія, геаграфічны дэтэрмінізм, марская моц, клімат, экспансія, калоніі, геапалітыка, погляды, канцэпцыя.

**Для цытавання:** Астрога В. А. Уплыў Вялікіх геаграфічных адкрыццяў на развіццё еўрапейскай геапалітычнай думкі // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2022. № 2 (263). С. 5–10.

**V. A. Ostroga**
Belarusian state university

## THE INFLUENCE OF THE GREAT GEOGRAPHICAL DISCOVERIES ON THE DEVELOPMENT OF EUROPEAN GEOPOLITICAL THOUGHT

The article examines the development of geopolitical views in Europe during the period of Great Geographical Discoveries. A detailed description of the essence of the era of Great Travel is given, the works of the most prominent and well-known European philosophers, geographers and historians, economists and lawyers in this field are analyzed and characterized, such as: Gonzalo Fernández de Oviedo, Bartolomé de las Casas, Jean Bodin, Hugo Grotius, William Penn, Charles Louis de Montesquieu, Anne Robert Jacques Turgot. The connection of the geopolitical views and concepts of European thinkers with ancient geopolitical theories is revealed. The unexplored nature of the problem of the development of European geopolitical thought in belarusian historiography is noted. It is concluded that the geopolitical views of the thinkers of Europe subsequently became the foundation of the theories of the classics of geopolitical thought of the XIX–XX centuries and modernity.

**Keywords**: history, geography, geographical determinism, sea power, climate, expansion, colonies, geopolitics, views, concept.

**For citation:** Ostroga V. A. The influence of the Great geographical discoveries on the development of european geopolitical thought. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2021, no. 2 (263), pp. 5–10 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Вялікія геаграфічныя адкрыцці еўрапейскіх краін падштурхнулі цікавасць да геапалітыкі як тэорыі і практыкі замацавання вядучай ролі пэўнай дзяржавы ў свеце, памеры якой з XV ст. значна «пашырыліся». Адзначаючы сувязь геапалітыкі і Вялікіх геаграфічных адкрыццяў трэба падкрэсліць, што ўся гісторыя гэтай эпохі запоўнена прыкладамі

менавіта геапалітычных, геаэканамічных і геастратэгічных дзеяннняў, дзе галоўнымі акторамі адпачатку ў пагоні за золатам і ўладаю сталі выступаць атлантычныя пірэнейскія дзяржавы – Іспанія і Партугалія, а некалькі пазней і іншыя ўладары буйных марскіх флотаў – Францыі, Англіі і Галандыі. Як заўважаюць расійскія географы Коласаў У. А. і Міраненка М. С., кажучы пра ўплыў Вялікіх геаграфічных адкрыццяў на эвалюцыю геапалітыкі: «Сучасная геапалітычная структура свету мае глыбокія гістарычныя карані. Становішча краін у сучаснай сусветнай сістэме фармавалася амаль пяць стагоддзяў, пачынаючы з першага перадзелу свету ў 1494 г. (Тардэсільяская дамова) і працягваючы ў 1529 г. (Сарагоская дамова) паміж Іспаніяй і Партугаліяй. Еўрапейская глабальная экспансія з’явілася падставай цэнтральна-перыферычнай будовы свету, у падмурку якой ляжыць механізм тэрытарыяльнага пашырэння і падпарадкавання» [1, с. 174]. Цікавую думку выказаў і брытанскі палітгеограф Тэйлар П., які выдзеліў чатыры перыяды (эры) каланіяльнай актыўнасці, што прыпалі на разглядаемы намі перыяд. Першая эра з моманту адрыццяў была названа «неканкурэтнай эрай каланізацыі». Адзінымі метраполямі тады былі Іспанія і Партугалія. Іх тэрытарыяльныя захопы ішлі паралельна без істотных супярэчнасцяў. Другі перыяд прыйшоўся на 1600–1800 гг. і атрымаў назву «Першая канкурэнтная эра каланізацыі». Вучоны лічыў, што яе найбольш важным геапалітычным трэндам была змена вектара гегемоніі ў паўночным кірунку і адзначаны дзейнасцю тых краін Еўропы, якія хутчэй, чым Іспанія і Партугалія, развівалі рынкавую гаспадарку. Больш за тое, ён звярнуў увагу, што ўжо ў другой палове XVI ст. каля 90% еўрапейскіх тавараў, якія пастаўляліся ў іспанскія калоніі, былі не іспанскага паходжання. У выніку адбывалася перамяшчэнне іспанскіх і партугальскіх багаццяў у Вялікабрытанію і Нідэрданды [1, с. 178–179].

Такім чынам, прапанаваная да разгляду праблема актуальная і мае некаторыя адлюстраванні ў замежнай гістарыяграфіі. Але фактычна яна не вывучана беларускімі даследчыкамі, таму, несумненна, мае высокі ўзровень навізны і патрабуе свайго асвятлення.

**Асноўная частка.** Характарызуючы ўздзеянне Вялікіх геаграфічных адкрыццяў на развіццё еўрапейскай геапалітычнай думкі, трэба найперш адзначыць спецыфіку самой эпохі. На пачатку XV ст. ва ўмовах безупынных унутраных і міждзяржаўных канфліктаў у краінах Сярэдняй і Паўднёвай Еўропы, на яе захадзе – Пірэнейскім паўвостраве склалася адносная стабільнасць, Рэканкіста ўжо заканчвалася, і пірэнейскія Іспанія і Партугалія пачалі шукаць кірункі ўжывання сваёй вызваленай энергіі і новых магчымасцяў. На той час гэтыя перспектывы ўжо былі дастаткова яснымі і зразумелымі – пошук марскіх шляхоў дзеля атрымання доступу да ўсходніх «індыйскіх» вострых прыпраў, а таксама золата і срэбра. Справа ў тым, што гандаль вострымі прыправамі забяспечваў купцу астранамічныя прыбыткі ў тысячу адсоткаў. Нездарма ў той час, каб падкрэсліць багацце чалавека, казалі, што ён як «мех з перцам». У сваю чаргу, паступовае развіццё таварна-грашовых адносін на кантыненце вымагала ўсё большы і большы аб’ём каштоўных металаў, якія ў шахтах Еўропы ў дастаковай колькасці не здабываліся. Але на той час рэалізацыі, як здавалася шмат каму, ранейшых авантурных планаў пошуку вострых прыпраў і золата «за краем свету», ужо відавочна садзейнічаў і прагрэс ў мараплаванні – развіццё новых лепшых караблёў, навігацыі і картаграфіі, а таксама артылерыйскай справы, арганізацыі дзяржаўнага кіравання і гандалю. У выніку гэтай прагі да вялікіх багаццяў і новых магчымасцяў ў 1492 г. адбылося адкрыццё Амерыкі іспанскім мараплавальнікам Хрыстафорам Калумбам, у 1497–1499 гг. партугалец Васка да Гама адкрыў марскі шлях з Еўропы ў Індыю, а ў 1519–1522 гг. таксама партугалец Фернан Магелан ажыццявіў першае кругасветнае плаванне. Гэтыя падзеі ў наступным разгарнулі вытворныя ад іх працэсы ў заходнееўрапейскіх краінах – каланіяльныя захопы і стварэнне каланіяльных імперый, змаганне за каланіяльныя ўладанні і сусветнае панаванне, фарміраванне сусветнага рынку і пачатак глабалізацыі на нашай планеце.

Глабальнасць новых магчымасцяў добра разумелі і ў тыя часы. У 1494 г. Хрыстафор Калумб пісаў у сваім «Мемарыяле» да іспанскіх манархаў Ізабэлы і Фердынанда пра новыя адкрытыя землі: «прыход у гэты край нашага флоту, настолькі зладжанага і прыгожага, надаў бы нам вялікі аўтарытэт і забяспечыў нашыя будучыя пачынанні. Калі ўсё насельніцтва гэтага настолькі вялікага вострава [*в. Гаіці – В. А. Астрога*] і іншых запэўніцца ў тым, як добра абыходзяцца з добрымі і як караюць злых, яно хутка прыйдзе ў падпарадкаванне, і гэтымі людзьмі можна будзе распараджацца як з васаламі). Іх Высокасці могуць быць упэўнены ў тым, што і там [*у Еўропе – В. А. Астрога*] прыбыццё гэтага флоту ўсяляк узвысіць іх у меркаванні хрысціянскіх уладароў…» [2, с. 39].

Як мы бачым на прыкладзе Іспаніі і Партугаліі, іх марскі патэнцыял ў той перыяд стаў найкаштоўнейшым. Вядомы ў свой час

тэарэтык «марской моцы» савецкі адмірал Гаршкоў С. Р. пазначаў: «Магутнасць флотаў была адным з фактараў, якія садзейнічалі пераходу асобных дзяржаў у лік вялікіх дзяржаў. Больш за тое, гісторыя дэманструе, што дзяржавы, у якіх не было ваенна-марсіх сіл, не мелі магчымасці працяглы час займаць становішча вялікіх дзяржаў» [3, с. 93].

Высілкі пірэнейскіх краін далі свой плён. Іспанскі гісторык Лалагуна Х. падкрэслівае: «Амерыка прынесла вялізныя багацці, якія забяпечылі панаванне Кастыліі ў Еўропе і па-за яе межамі на сто гадоў наперад… Пастаўкі золата ўзраслі з 5000 кг ў 1503–1510 гг. да рэкордных 42 620 кг у 1550-х гг., а партыі срэбра павялічыліся з 86 тон ў 1530-х гадах да максімальных 2707 тон да апошняга дзесяцігоддзя XVI ст.» [4, с. 113]. У той час кожны еўрапейскі манарх імкнуўся манапалізаваць адкрытыя марскія шляхі. Гэта прывяло да таго, што Іспанія і Партугалія адразу сталі смяротнымі канкурэнтамі. Так, брытанскі даследчык Бэйкер Дж., кажучы пра стварэнне партугалькіх калоній пасля экспедыцыі Васка да Гамы, піша: «Віцэ-каралём партугальскай Індыі быў прызначаны Афонсу Албукеркі… палітыка Албукеркі заключалася ў тым, каб пашырыць тэрытарыяльную базу партугальскай імперыі… зрабіць гандаль манаполіяй партугальскага ўрада» [5, с. 86 ]. Гістарычны лёс Іспаніі і Партугаліі склаўся так, што ў 1580 г. яны аб'ядналіся ў адну унію пад уладаю іспанскага караля, і зараз абедзве краіны ўжо сумесна імкнуліся падпарадкаваць свайму ўладарству ўсю прастору, дзе яны панавалі раней паасобку, як у Амерыцы, так і ў Азіі. Аднак паступова, па меры ўпадку Іспаніі і Партугаліі і іх здольнасці абараняць свае ўладанні з другой паловы XVI ст. пачала расці моц і пашыраліся заморскія імперыі Францыі, Англіі і Галандыі. Гэтыя краіны ўсяляк імкнуліся падарваць каланіяльную манаполію пірэнейскіх дзяржаў. Як пазначаюць даследчыкі, менавіта «Вялікія геаграфічныя адкрыцці з часам зрабілі вялізны ўплыў на… суадносіны сіл у самой Еўропе, дзеючы на карысць краінам, якія межавалі да яе атлантычнага "фасаду"… пачынаецца эра гандлёвых войн, арэнай для якіх служыць зямны шар» [6, с. 410 ]. Можна казаць, што з гэтага часу сутыкненение інтарэсаў еўрапейскіх дзяржаў у Азіі, Афрыцы і Амерыцы ўжо робіць сур'ёзны ўплыў як на ўласна еўрапейскую, так і ўвогуле на сусветную палітыку.

Першым супернікам стала Францыя, якая сама прагнула стварэння каланіяльнай імперыі і на гэты час ужо выйшла з бясконцых войн і рашуча стала «на шляху… глабальных амбіцый Іспаніі… Па ўсіх прычынах, геаграфічных, эканамічных і палітычных, Францыя не магла застацца ў баку ад змагання за валоданне новымі землямі» [7, с. 11 ]. Дарэчы, цікава зазначыць, што яшчэ Страбон у сваёй «Геаграфіі» адзначаў выгаднае стратэгічнае становішча Кельтыкі-Галіі, якая мела выйсце ў Атлантычны акіян і Міжземнае мора [8, с. 126].

Натуральна, французскія ўлады гэтай краіны бачылі выгаднае геаграфічнае становішча Францыі. Асабліва адметнаю ў гэтым кірунку стала дзейнасць Армана-Жана дзю Плесі – герцага дэ Рышэл'ё, больш вядомага як кардынал Рышэл'ё. Гэты французскі дзяржаўны і рэлігійны дзеяч вельмі шмат зрабіў для фарміравання марской моцы Францыі і яе будучых каланіяльных поспехаў. Усведамляючы важнасць перавагі краіны ў морах, ён «упершыню звярнуў увагу на будаўніцтва марскога флоту, паставіўшы мэту пабудаваць 45 баявых караблёў у Атлантыцы і 30 галер у Міжземным моры» [7, с. 15]. Адначасова ім было загадана мадэрнізаваць галоўныя марскія порты – Тулон, Гаўр, Брэст і Бруат. У 1626 г. ён стварае Марскую раду і ўзначальвае яе, а французскі кароль Людовік XIII прызначае Рышэльё на пасаду «гросмайстра, начальніка і сюрінтэнданта марскога і гандлёвага флоту Францыі». У тым жа годзе кардынал, выступаючы перад Асамблеяй натабляў, выказаўся за стварэнне моцнага флоту: «Няма іншага каралеўства, якое б было размешчана так удала, як Францыя, і настолькі багата неабходнымі сродкамі для таго, каб стаць гаспадаром на моры» [7, с. 15]. Кардынал у сваёй працы «Прынцыпы кіравання дзяржаваю» пісаў: «Гледзячы на выгаднае размяшчэнне двух французскіх узбярэжжаў – акіянскага і міжземнаморскага, якія роўным чынам валодаюць выдатнымі портамі, здаецца, быццам бы прырода наважылася падараваць Францыі панаванне над морамі» [9, с. 267]. Даследчык яго дзейнасці П. П. Чаркасаў піша: «…падводзячы вынікі развіцця марской і каланіяльнай экспансіі пры кардынале Рышэльё, можна адзначыць, што ўпершыню яна набыла палітычны, а не чыста гандлёвы, як раней, характар… За перыяд з 1600 па 1660 г. у Францыі з'явілася 450 кніг з апісаннем невядомых раней краін Амерыкі, Азіі і Афрыкі» [7, с. 15].

Англія была яшчэ адным буйным геапалітычным суб'ектам перыяду Вялікіх геаграфічных адкрыццяў, але напачатку, у XVI ст., пытанне пра набыццё ўласных калоній ёй не ўздымалася, бо для гэтага не хапала ні дастатковых капіталаў, ні дастатковай колькасці вольных людзей. Аднак пасля паражэння Вялікай Армады ў 1588 г. перспектывы захопу іспанскіх калоній пачалі падавацца англічанам значна простай задачай, тым больш для

англійскай прамысловасці, якая пачала развівацца, існавала жыццёвая патрэба ў новых рынках збыту тавараў. Нават у Англіі з’явіліся трактаты, у якіх абгрунтоўвалася неабходнасць экспансіі і стварэння імперыі [10, с. 32].

Брытанскі гісторык Пэры Д. прыйшоў да высновы, што ў XV–XVI стст. быў назапашаны вялізарны аб’ём геаграфічных ведаў, а надалей – «Беспрэцэндэнтная ўлада, якую далі веды, у рэшце рэшт прывялі Еўропу ад разведвальных даследчых паходаў для заваёвы ўсяго свету і, такім чынам, стварылі ўчарашні свет, пераважна якім кіравалі еўрапейцы, і свет сённяшні, амаль цалкам які прыняў еўрапейскія тэхналогіі і метады кіравання хай нават толькі для таго, каб пазбегнуць рэальнай улады еўрапейцаў» [11, с. 17]. Вось такі гістарычны кантэкст ў нейкім сэнсе рэвалюцыйнай эпохі Вялікіх геаграфічных адкрыццяў стварыў ўмовы для новага імпульсу развіцця геапалітычнай думкі. Брытанскі гісторык Кёнігсбергер Г. адзначаў: «Людзі Сярэднявечча разглядалі палітычную думку... як складовую частку думкі маральнай і рэлігійнай. Аднак з часоў Макіявелі, напачатку XVI ст., чыста рацыянальныя і свецкія тэорыі ўсё больш выцяснялі маральную і рэлігійную праблематыку…» [12, с. 14 ]. З гэтым трэба пагадзіцца, тым больш, што рэлігійныя матывы сапраўды здзяйснялі вялікі ўплыў на ўдзельнікаў «заморскіх экспедыцый», а місіянерства разам з жаданнем адкрыцця новых марскіх шляхоў было адным з фактараў імкнення «за моры». Гэта заўважальна адлюстроўвалася і ў грамадскай думцы таго часу, асабліва Іспаніі і Партугаліі.

Феадальная Іспанія часоў геаграфічных адкрыццяў мела адпаведную ідэалогію, шырака прасякнутую рэлігіёзнымі пачуццямі. Так, іспанскі гісторык і этнограф, чыноўнік і пісьменнік **Фернандэс дэ Авьеда** (*Gonzalo Fernández de Oviedo y Valdés*, 1478–1557) лічыўся прыхільнікам імперскай ідэалогіі. Ён шмат разоў плаваў у Новы Свет, займаў там розныя адказныя адміністрацыйныя пасады. У 1532 г. быў прызначаны гістарыёграфам Індый. Ён лічыў іспанцаў богаабраным народам, сцвярджаў іх правы валодаць Новым светам, каб выканаць высокую духоўную місію хрысціянізацыі індзейцаў, якіх ён лічыў непаўнавартаснымі людзьмі, хаця адначасова і крытыкаваў жорсткасць многіх канкістадораў. Яго галоўная праца – «Натуральная і агульная гісторыя Індый», у якой аўтар выступае з пазіцый апалагета іспанскай каланізацыі, ідэолага Сусветнай Каталіцкай манархіі. Яго ідэйны супраціўнік – **Барталаме дэ Лас Касас** (*Bartolomé de las Casas*, 1484–1566), аўтар фундаментальнай працы «Гісторыя Індый». Зрэшты, погляды Авьеда цікавыя і ў тым сэнсе, што іх прытрымліваліся большасць сучаснікаў, у той час як перадавыя думкі Лас Касаса сустракалі ў іх здзіўленне і супрацьдзеянне.

У XVI ст. адным з першых, хто пачаў сістэматычнае вывучэнне ўзаемасувязяў геаграфіі і палітыкі, быў французскі мысліцель, філосаф, эканаміст, прафесар права **Жан Бадэн** (*Jean Bodin*, 1530–1596 гг.). Ён, як прыхільнік геаграфічнага дэтэрмінізму, сцвярджаў, што моц і развіццё дзяржавы непасрэдна залежаць ад прыродных умоў, як казалі ўжо класічныя геапалітыкі праз два стагоддзі пазней. У сваёй шырака вядомай працы «Метад лёгкага пазнання гісторыі» ён пісаў, што для разумення «прыроды дзяржаўнасці» патрэбна ведаць «прыроду народа», якая ўзаемазвязана з геаграфічным месцазнаходжаннем, і найперш з кліматам. Менавіта клімат ён лічыў найважнейшым фактарам уплыву на становішча ў дзяржаве: «Лепшы клімат стварае лепшыя традыцыі», пісаў ён [13, с. 89]. У якасці аргумента Жан Бадэн прыводзіў словы старажытнага грэчаскага філосафа Платона, што «некаторыя народы «зроблены» лепш, чым іншыя … праз моцную розніцу іх месцаў жыхарства» 13, с. 79]. У сваёй працы ён шмат разважае аб уплыве прыродных фактараў на характар народаў Поўначы і Поўдня, Усходу і Захаду. Напрыклад, ён згаджаўся з антычнымі філосафамі, што «хто жыве ў паўночных землях, з’яўляецца больш актыўным і моцным, чым жыхары Поўдня... гэта дэманструе праўду, якая падаецца непраўдападобнай, якая заключаецца ў тым, што найвялікшыя імперыі заўсёды ўзнікалі на поўдні, аднак яны зрэдку пашыраліся ў кірунак поўначы» [13, с. 84]. У выніку адна з ягоных высноў – «сярод усіх народаў Еўропы самыя заходнія – брытанцы і іспанцы, і менавіта яны самыя актыўныя» [13, с. 117]. Наяўнасць шматлікіх іспаскіх, а затым брытанскіх марскіх экспедыцый у розных кутках свету дэманструе рацыянальнае зерне ў поглядах французкага навукоўца. Акрамя таго, свае геапалітычныя перакананні, уплывы геаграфічнага асяроддзя, клімату на развіццё дзяржавы ён выказаў яшчэ ў дзвюх працах «Кніга аб дзяржаве» і «Шэсць кніг аб рэспубліцы». Так, у апошняй прапануе ідэю геаграфічнай тыпалогіі дзяржаў, згодна з якой для ўмеранага пояса тыповым з’яўляецца дзяржава «розуму», бо народы маюць адчуванне справядлівасці… паўднёвыя народы маюць патрэбу ў рэлігійнай уладзе, народы поўначы магчыма прымусіць падпарадкавацца толькі моцнай дзяржаве [14, с. 44].

У межах нашай тэмы неабходна адзначыць і галандскага юрыста і дзяржаўнага дзеяча, філосафа і паэта **Гуга Гроцыя** (*Hugo Grotius*, 1583–1645 гг.), які, як лічыцца, паклаў падмурак

міжнароднага права ў сваім трактаце «Аб праве вайны і міру» (1625 г.). У гэтай энцыклапедычнай па форме працы, поўнай гістарычных прыкладаў, ён прызнаваў суверэнітэт самастойных дзяржаў Еўропы, але лічыў войны з'яваю непазбежнаю, хаця і бясплоднаю. Даследчыкі мяркуюць, што яго ідэямі цікавіліся тагачасныя еўрапейскія ўладары і дыпламаты, і ён непасрэдна ўздзейнічаў на дзяржаўную практыку. Шматлікія цытаты з сачыненняў найперш антычных аўтараў робяць гэтую ўнікальную працу звязанай шматлікімі ніцямі са сферай геапалітыкі.

Эпоха Вялікіх геаграфічных адкрыццяў нарадзіла і такога брытанскага грамадскага дзеяча як **Уільям Пэн** (*William Penn*, 1644–1718). Гэта быў знакаміты квакер, філосаф, заснавальнік брытанскай калоніі Пенсільванія ў Паўночнай Амерыцы. Яго думкі гучалі на той час вельмі своеасабліва. Ён у сваім сачыненні «Досвед аб сапраўдным і будучым міры ў Еўропе шляхам стварэння Еўрапейскага кангрэса, Парламента ці Палаты дзяржаў» (1693) прапануе кіраўнікам і жыхарам еўрапейскіх дзяржаў аб'яднацца для вечнага міру і шчасця, дзеля справядлівасці, у імя спынення войн. Менавіта ён падаў праект не геапалітычных падзелаў новых земляў, а аб'яднання еўрапейскіх дзяржаў дзеля прымірэння і бяспекі свету [15, с. 140].

Можна казаць, што пасля Ж. Бадэна аналіз уплыву геаграфічных фактараў на дзяржаву і палітыку пэўны час не быў сярод цэнтральных праблем еўрапейскай грамадска-палітычнай думкі. І толькі ў першай палове XVIII ст. яна зноў выклікае цікавасць і становіцца аб'ектам увагі французскага правазнаўцы, філосафа і асветніка **Ш. Л. Мантэск'ё** (*Charles Louis de Seconda, Baron de La Brède et de Montesquieu*, 1689–1755). Ён фактычна стаў прадаўжальнікам геадэтэрмінічных ідэй Ж. Бадэна, але не абмежаваўся развагамі пра значнасць навакольнага асяроддзя. У сваёй працы «Аб духу законаў» (1748) ён непасрэдна звязаў сацыяльна-палітычную сітуацыю ў дзяржаве з кліматам, які лічыў найважнейшым геаграфічным фактарам палітыкі, чым развіў ідэі Ж. Бадэна. Так, філосаф лічыў, што «народы спякотных кліматаў баязлівыя, як старыя, народы халодных кліматаў адважныя, як юнакі» [16, с. 198]. Паводле меркавання Ш. Л. Мантэск'ё, «дух законаў» краіны павінен адпавядаць умовам яе геаграфічнага асяроддзя – «калі справядліва, што характар розуму і палкасці сэрца надзвычай розныя ў розных кліматах, то законы павінны адпавядаць і розніцы гэтых палкасцяў, і розніцы характару» [16, с. 198]. Гэтыя ідэі адыгралі ў наступным важную ролю ў развіцці базавых пастулатаў класічнай геапалітыкі.

Апошнім заўважальным прадстаўніком французскай геаграфічнай школы ў грамадскай думцы XVIII ст. быў філосаф, эканаміст, дзяржаўны дзеяч **Ан Рабер Жак Цюрго** (*Anne Robert Jacques Turgot*, 1727–1781). Менавіта яго лічаць стваральнікам тэрміна «палітычная геаграфія». Пад уплывам ідэй Ш. Л. Мантэск'ё ён праанalізаваў сувязі паміж геаграфічным і палітычным працэсамі. Так, ён піша: «Народы, якія жылі ў гарыстых халодных і бясплодных краінах, з'яўляюцца заваёўнікамі раўнін, ствараюць імперыі альбо супраціўляюцца апошнім. Яны бяднейшыя, мацнейшыя, больш няўразлівыя; яны маюць час для нападаў і выбару пазіцыі для самаабароны» [17, с. 98]. Адзначым, што А. Цюрго для сваіх разваг ужывае шмат прыкладаў з жыцця абарыгенаў Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі.

**Заключэнне.** Такім чынам, Вялікія геаграфічныя адкрыцці XV–XVI стст. распачалі эпоху геапалітычнай канкурэнцыі наступных стагоддзяў і «Вялікай геапалітыкі» XIX ст. У гэты час пачалося фарміраванне каланіяльных імперый і сусветнага рынку. Менавіта гэтыя падарожжы, з аднаго боку, пашырылі далягляды пазнання свету, але, з другога, зрабілі яго меншым, вядомым. Яны далі моцны імпульс для разнастайных навуковых даследаванняў, у тым ліку ў галіне гісторыі і геаграфіі, грамадскіх навук, чым стварылі аснову для фарміравання ў XIX ст. класічных геапалітычных тэрмінаў, ідэй і канцэпцый.

## Спіс літаратуры


1. Колосов В. А., Мироненко Н. С. Геополитика и политическая география. М.: Аспект-Пресс, 2001, 479 с.
2. Хроники открытия Америки. Новая Испания. Кн. 1: Исторические документы. М.: Академический проект, 2000. 496 с.
3. Горшков С. Г. Морская мощь государства. Изд. 2-е, доп. М.: Воениздат, 1979. 416 с.
4. Лалагуна Х. Испания: История страны. М.: Эксмо; СПб.: Мидгард. 2009. 352 с.
5. Бейкер Дж. История географических открытий и исследований. М.: Изд-во «Иностранная лит.», 1950. 648 с.
6. История Европы. Т. 3. От средневековья к новому времени (конец XV – первая половина XVIII в.). М.: Наука, 1993. 656 с.
7. Черкасов П. П. Судьба империи. М., 1983. 183 с.
8. Страбон. География. Л.: Наука, 1964. 943 с.

9. Ришелье А. Ж. дю П. Политическое завещание, или Принципы управления государством. М.: Ладомир, 2008. 489 с.

10. Капитонова Н. К. История внешней политики Великобритании. М.: Международные отношения, 2016. 838 с.

11. Перри Д. Эра великих географических открытий. М.: Центрполиграф, 2019. 445 с.

12. Кёнигсбергер Г. Г. Европа раннего нового времени, 1500–1789. М.: Изд-во «Весь мир», 2006. 329 с.

13. Боден Ж. Метод легкого познания истории. М.: Наука, 2000. 411 с.

14. Мельник В. А. Политология: учебник. Минск: Выш. шк., 2006. 543 с.

15. Геополитика. М.: Академический проект: Культура, 2006. 1002 с.

16. Монтескье Ш. Л. О духе законов. М.: Мысль, 1999. 672 с.

17. Тюрго А. Р. Избранные философские произведения. М.: Соцэкгиз, 1937. 190 с.

## References

1. Kolosov V. A., Mironenko N. S. *Geopolitika i politicheskaya geografiya* [Geopolitics and political geography]. Moscow, Aspekt-Press Publ., 2001. 479 p. (In Russian).

2. *Khroniki otkrytiya Ameriki. Novaya Ispaniya. Kn. 1: Istoricheskiye dokumenty* [Chronicles of the discovery of America. New Spain. Book 1: Historical Documents]. Moscow, Akademicheskiy proyekt Publ., 2000. 496 p. (In Russian).

3. Gorshkov S. G. *Morskaya moshch' gosudarstva* [Maritime power of the state]. Moscow, Voyenizdat Publ., 1979. 416 p. (In Russian).

4. Lalaguna Kh. *Ispaniya: Istoriya strany* [Spain: History of the country]. Moscow, Eksmo Publ.; St. Petersburg, Midgard Publ., 2009. 352 p. (In Russian).

5. Beyker Dzh. *Istoriya geograficheskikh otkrytiy i issledovaniy* [History of geographical discoveries and research]. Moscow, Izd-vo "Inostrannaya literatura" Publ., 1950. 648 p. (In Russian).

6. *Istoriya Evropy. T. 3: Ot srednevekov'ya k novomu vremeni (konets XV – pervaya polovina XVIII v.)* [History of Europe. Vol. 3: From the Middle Ages to the New Age (the end of the 15th – the first half of the 18th century)]. Moscow, Nauka Publ., 1993. 656 p. (In Russian).

7. Cherkasov P. P. *Sud'ba imperii* [The fate of the empire]. Moscow; Leningrad, 1983. 183 p. (In Russian).

8. Strabon. *Geografiya* [Geography]. St. Petersburg, Nauka Publ., 1964. 943 p. (In Russian).

9. Rishel'e A. Zh. dyu P. *Politicheskoye zaveshchaniye, ili Printsipy upravleniya gosudarstvom* [Political Testament or Principles of Government]. Moscow, Ladomir Publ., 2008. 489 p. (In Russian).

10. Kapitonova N. K. *Istoriya vneshney politiki Velikobritanii* [History of British foreign policy]. Moscow, Mezhdunarodnyye otnosheniya Publ., 2016. 838 p. (In Russian).

11. Perri D. *Era velikikh geograficheskikh otkrytiy* [The era of great geographical discoveries]. Moscow, Tsentrpoligraf Publ., 2019. 445 p. (In Russian).

12. Kenigsberger G. G. *Evropa rannego novogo vremeni, 1500–1789* [Early Modern Europe, 1500–1789]. Moscow, Izdatel'stvo "Ves' mir" Publ., 2006. 329 p. (In Russian).

13. Boden Zh. *Metod legkogo poznaniya istorii* [Method of easy knowledge of history]. Moscow, Nauka Publ., 2000. 411 p. (In Russian).

14. Mel'nik V. A. *Politologiya: uchebnik* [Political science: textbook]. Minsk, Vysheychaya shkola Publ., 2006. 543 p. (In Russian).

15. *Geopolitika* [Geopolitics]. Moscow, Akademicheskiy proyekt: Kul'tura Publ., 2006. 1002 p.

16. Montesk'e Sh. L. *O dukhe zakonov* [About the spirit of the laws]. Moscow, Mysl' Publ., 1999. 672 p. (In Russian).

17. Tyurgo A. R. *Izbrannyye filosofskiye proizvedeniya* [Selected philosophical works]. Moscow, Sotsekgiz Publ., 1937. 190 p. (In Russian).

## Інфармацыя пра аўтара

**Астрога Віктар Аляксандравіч** – доктар гістарычных навук, прафессар, загадчык кафедры мытнай справы. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь). E-mail: ostroga.v@mail.ru

## Information about the author

**Ostroga Victor Alexandrovich** – DSc (History), Professor, Head of the Department of customs Affairs. Belarusian State University (4, Nezavisimosti Ave., 220030, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: ostroga.v@mail.ru

*Пастyпiў 12.09.2022*